УДК 37.016

# ФАРМІРАВАННЕ Ў МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКА Ў УЯЎЛЕННЯЎ ПРА КАРЦІНУ СВЕТУ НА АСНОВЕ ЗНАЁМСТВА З БЕЛАРУСКІМІ АЎТАРСКІМІ ЗАГАДКАМІ

Д. М. Сметанчук
*УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»;*
*Мінск (Рэспубліка Беларусь)*
*Навуковы кіраўнік – А. С. Васілеўская, к.філ.н., дацэнт*

# THE FORMATION OF EARLY SCHOOLCHILDREN'S IDEA ABOUT THE PICTURE OF THE WORLD BASED ON FAMILIARITY WITH BELARUSIAN AUTHOR'S MYSTERIES

D. M. Smetanchuk
*Belarusian State Pedagogical Universitythe name of Maksim Tank;*
*Minsk (Republic of Belarus)*
*Scientific supervisor – A. S. Vasilevskaya, PhD, Associate Professor*

Аўтары артыкула звяртаюць увагу на лінгвакультуралагічны аспект вывучэння аўтарскіх загадак у пачатковых класах, паказваюць, як у загадках адлюстроўваецца карціна свету беларусаў.

The authors of the article draw attention to the linguistic and cultural aspect of the study of the author's riddles in primary grades, show how the riddles reflect the picture of the world of Belarusians.

Ключавыя словы: аўтарскія загадкі; карціна свету; лінгвакультуралагічная кампетэнцыя; метафара; малодшыя школьнікі.

Keywords: author's riddles; picture of the world; linguistic and cultural competence; metaphor; younger students.

Чалавек на працягу ўсяго жыцця знаёміцца з навакольным светам. Усё, што яму незразумела і невядома, дапамагаў усвядоміць вопыт папярэдніх пакаленняў, занатаваны ў прыказках, павер’ях і, безумоўна, загадках. Жанравая адметнасць загадак заключаецца ў тым, што «іх асноўнай мастацка-творчай задачай з’яўляецца паэтычнае, іншасказальнае адлюстраванне Сусвету» [1, с. 14].

Загадкі і ў наш час застаюцца папулярнымі. Ніякі іншы від або жанр фальклору ніколі не зможа замяніць загадку, бо «калі казачны эпас садзейнічае развіццю творчай фантазіі, а таксама з’яўляецца своеасаблівай маральнай і сацыяльнай педагогікай, калі песні і прыпеўкі ўплываюць пераважна на эмацыянальны лад чалавечай душы і служаць выхаванню пачуццяў, калі

прыказка і прымаўка вучаць жыццёвай філасофіі, уменню аналізаваць і абагульняць з'явы грамадскага жыцця, то загадкі прызначаны перш за ўсё для таго, каб адкрываць чалавеку паэзію ва ўсім, што яго акружае, каб развіць у ім здольнасць глядзець на свет навакольных прадметаў і з'яў вачыма паэта» [2, с. 8].

Пра педагагічную вартасць загадак В. Вітка пісаў: «У вялікім вопыце народнай педагогікі загадка была і ёсць найпершым падручнікам выхавання чуйнага слыху да слова, да ўсіх яго сэнсавых, вобразных, эмацыянальныхі гукавых багаццяў. І гэты нічым незаменны падручнік з пакалення ў пакаленне складаюць, выпрабоўваюць і ўдасканальваюць самыя мудрыя народныя педагогі» [3, с. 104].

Традыцыйна загадку акрэсліваюць як фальклорную мініяцюру, якая ў форме пытання падае іншасказальнае вобразнае апісанне пэўных прадметаў ці з'яў [4, с. 492]. Аднак не менш папулярнымі ў наш час з'яўляюцца літаратурныя (аўтарскія) загадкі.

Патрабаванні да дзіцячых вершаў увогуле і да загадак у прыватнасці сфармуляваў К. І. Чукоўскі ў сваёй кнізе «Ад двух да пяці»: вершаваны твор павінен быць графічным, калі ў кожнай страфе ёсць матэрыял для мастака, слоўны жывапіс павінен быць лірычным, а паэтычная мова дзіцячых вершаў павінна быць музычнай і інш. [5, с. 279]. Гэтым патрабаванням, на нашу думку, адпавядаюць сучасныя загадкі У. Мазго, Н. Гілевіча, М. Пазнякова і інш. паэтаў: *На дзень нараджэння і іншыя святы яго мы прыносім заўсёды дахаты. Замяніце літару ў слове калі – да месцы стаянкі ідуць караблі* (порт; У. Мазго); *Нішто не ляцела, нішто не спужала, а ўся задрыжала* (асіна; Н. Гілевіч); *Хвалюе водарам, красою, але не проста ўзяць рукою. Галава пахучая, тулава – калючае* (ружа; М. Пазнякоў).

Цікавымі падаюцца крытэрыі рэдактарскай ацэнкі літаратурнай загадкі: загаданы аб'ект павінен быць цікавым для дзяцей і сучасным; загадка не павінна быць вельмі відавочнай (у яе аснову трэба пакласці другасныя прыкметы), загаданы прадмет мэтазгодна вызначаць праз дзеянне [6, с. 42].

Многія загадкі беларускіх аўтараў адпавядаюць і гэтым крытэрыям, напрыклад: *Я з металу рукі маю, карабель за нос трымаю. А апусцяць – тры рукі разгарну на дне ракі* (якар; У. Мацвеенка).

Класіфікацыя і тэматычная сістэматызацыя загадак грунтоўна распрацавана А. І. Гурскім, які вылучыў пяць вялікіх традыцыйных груп загадак: «Прырода і чалавек», «Гаспадарка і матэрыяльны быт», «Грамадскі і сямейны быт», «Культура», «Загадкі-жарты, загадкі-задачы» [1, с. 7].

З пазіцыі гэтай класіфікацыі мы прааналізавалі аўтарскія загадкі, змешчаныя ў сучасных падручніках па беларускай мове і беларускай літаратуры для 2–4 класаў. З 207 знойдзеных намі загадак 140 з'яўляюцца аўтарскімі.

Найбольшая колькасць аўтарскіх загадак, змешчаных на старонках падручнікаў, адносіцца да групы «Прырода і чалавек» – 66 % ад агульнай колькасці. У межах гэтай групы часцей за ўсё сустракаюцца загадкі пра дзікіх жывёл і птушак, рыб, паўзуноў, насякомых (30 загадак), пра стыхіі і з'явы прыроды (27 загадак), раслінны свет (27 загадак). Значна менш у падручніках загадак пра неба і нябесныя свяцілы (4), час і поры года (3), зямлю і ваду (2), чалавека (1). «Загадкі нашага часу» прадстаўлены 16 загадкамі, тэматычная група «Гаспадарка і матэрыяльны быт» – 15, тэматычная група «Школа. Асвета» – 11. Мы не знайшлі ў падручніках аўтарскія загадкі па тэме «Гаспадарка і матэрыяльны быт» (харчаванне і яда, сельская гаспадарка, гаспадарчыя пабудовы і прылады). Толькі адзінкавымі творамі прадстаўлены загадкі па тэме «Музыка» (3) з раздзела «Культура».

Аднак у параўнанні з народнымі загадкамі, аўтарскія загадкі больш разнастайныя па тэматыцы. З 21 тэмы, вылучанай у класіфікацыі А .І. Гурскага, у падручніках мы не знайшлі народных загадак па 9 тэмах: «Час і поры года», «Чалавек», «Земляробчыя прылады», «Гаспадарчыя пабудовы і прылады», «Адзенне. Абутак», «Транспартныя сродкі», «Шляхі – дарогі», «Харчаванне і яда», «Музыка». А літаратурных загадак толькі па 4 тэмах: «Сельская гаспадарка», «Гаспадарчыя пабудовы і прылады», «Харчаванне і яда», «Сямейны і грамадскі быт».

Такім чынам, прадстаўленыя ў падручніках па беларускай мове і літаратурным чытанні аўтарскія загадкі больш поўна адлюстроўваюць карціну свету, чым народныя загадкі, знаёмяць малодшых школьнікаў са значна большым колам прадметаў і з'яў наваколля. Навучэнцы атрымліваюць дастаткова вялікую інфармацыю пра матэрыяльную культуру, пра флору і фаўну Беларусі і ў меншай ступені знаёмяцца з духоўнай культурай нашай краіны.

У свой час К. І.Чукоўскі адзначаў, што «адзіным компасам для ўсіх пісьменнікаў – і моцных і слабых – з'яўляецца вусная народная творчасць» [5, с. 278]. Таму ў аснове многіх сучасных загадак, як і народных, ляжыць метафара (метафарычная маска).

Самай частотнай метафарычнай маскай аўтарскіх загадак з'яўляецца прадметна-вобразная, калі загаданыя з'явы параўноўвацца з прадметамі: *Сапсуецца самалёт – трапіць у бяду пілот. Выручыць пілота ён – незвычайны парасон* (парашут, У. Мацвеенка); *Разаслала далі і скакала весела, каляровы шалік між аблок павесіла* (вясёлка, М. Пазнякоў). Такая спецыфіка аўтарскіх

загадак, на наш погляд, якраз і звязана з патрабаваннем графічнасці, наяўнасці малюнка ў кожным радку загадкі.

Другой па частотнасці ўжывання з'яўляецца антрапаморфная метафарычная маска, калі загаданыя аб'екты набываюць рысы чалавека: *Танцуе з ветрам, снегу набраўшы ў прыпол, аж белага свету не бачыць яна вакол* (завея, М. Пазнякоў); *Плача і вые, гуляе па полі. Толькі ў рукі не возьмеш ніколі* (вецер, К. Камейша). Такія загадкі дазваляюць апісаць прадмет праз дзеянне, стварыць хуткую змену вобраза, пра што таксама пісаў К. І. Чукоўскі [5, с. 279].

Самай старажытнай метафарычнай маскай з'яўляецца зааморфная, калі загаданыя з'явы і прадметы паўставалі ў выглядзе жывёл, аднак аўтарскіх загадак, заснаваных на параўнанні загаданага прадмета з жывёлай, у сучасных падручніках змешчана не вельмі многа: *Не конь, а пасецца, у рукі не даецца* (вецер; У. Карызна); *Бяжыць і не спыняецца, ніколі не стамляецца* (вецер; У. Карызна).

Адзначаныя прадметна-вобразныя, антрапаморфныя і зааморфныя маскі з'яўляюцца традыцыйнымі для народных загадак і, як бачым, для аўтарскіх.

Аднак нярэдка сучасныя пісьменнікі параўноўваюць адну прыродную з'яву з іншай: *На полі цёмным і бясконцым гарох бялюткі ззяе, а цемру як разгоніць сонца, тады неба знікае* (неба; М. Пазнякоў); *Трапяткая прастора – цёмна-сіняе мора, як жывое, да рання ўсё пульсуе ад ззяння* (абрус; С. Шах). Таму можна, напэўна, гаварыць пра прыродную метафарычную маску.

Цікава параўнаць, як апісваюцца ў розных аўтарскіх загадках аднолькавыя прадметы: *Мы засынаем да вясны, мы бачым залатыя сны, мы ўвесну не мінём калод, мы вельмі, вельмі любім мёд* (У. Мацвеенка) і *Да вясны жыхар лясны не вылазіць з-пад пярыны, усю зімку бачыць сны пра салодкія маліны* (П. Сушко) (мядзведзь); *Я засяваю дол ігліцай, спрадвеку слаўлюся жывіцай* (А. Клышка) *і Кудлатая, калючая, высокая, рыпучая. Што восень, што вясна – зялёная* (сасна, С. Шах). Такое параўнанне дае магчымасць убачыць, якія прыметы вылучаюць аўтары пры апісанні загаданай з'явы: так, і У. Мацвеенка, і П. Сушко пры апісанні мядзведзя акцэнтуюць увагу на двух якасцях: на зімовую спячку і на любімыя прысмакі. Пры апісанні сасны А. Клышка і С. Шах вылучаюць розныя знешнія прыкметы.

Такім чынам, аўтарскія загадкі маюць свае жанравыя асаблівасці, аднак ствараюцца на фальклорнай аснове. У адрозненні ад народных загадак, літаратурныя творы гэтага жанру больш разнастайныя як па тэматыцы, так і па метафарычных масках.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Загадкі / склад. М. Я. Грынблат, А. І. Гурскі; рэд. А. С. Фядосік. – 2-е выд., выпр. і дапрац. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – 363 с.

2. Гілевіч, Н. С. Паэтыка беларускіх загадак / Н. С. Гілевіч. – Мінск : Вышэйш. шк., 1976. – 128 с.

3. Вітка, В. Дзеці і мы / В. Вітка. – Мінск : Маст. літ., 1977. – 241 с.

4. Рагойша, В. П. Паэтычны слоўнік / В. П. Рагойша. – Мінск : Вышэйш. шк., 1979. – 637 с.

5. Чуковский, К. От двух до пяти / К. Чуковский. – Минск : Нар. асвета. – 1984. – 319 с.

6. Зылевич, Д. П. Редакторская подготовка изданий для детей : учеб. для студентов специальности «Издательское дело» / Д. П. Зылевич. – Минск : БГТУ, 2022. – 232 с.